# ИСТОРИЯ. ФИЛОСОФИЯ. ПОЛИТОЛОГИЯ

**УДК 394.6 (476)**

## КІРМАШ У СТРУКТУРЫ ЭКАНАМІЧНЫХ АДНОСІН БЕЛАРУСАЎ ЗАХОДНЯГА ПАДЗВІННЯ (ПА МАТЭРЫЯЛАХ 1920-1930-Х ГГ. XX СТ.)

***К. А. АНТОНАВА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. наук, дац. У. Я. АЎСЕЙЧЫК)***

*Падчас сканчэння польска-савецкай вайны 18 сакавіка 1921 года тэрыторыя Заходняй Беларусі ўвайшла ў склад Польскай дзяржавы. Эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд знаходзілася на нізкім узроўні. Аднак гандаль на кірмашах заставаўся важным элементам эканомікі і культуры рэгіёна. У дадзеным артыкуле кірмаш разглядаецца ў структуры эканамічных адносін і беларусаў Заходняга Падзвіння.*

Эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд знаходзілася на нізкім узроўні. Польскі ўрад бачыў гэтую тэрыторыю толькі ў якасці крыніцы сыравіны і працоўнай сілы. Беларускія тэрыторыі сталі рынкам збыту для польскай прамысловай прадукцыі. Былі адноўлены буржуазныя адносіны. У працэсе ўкаранення польскіх парадкаў беларуская эканоміка стукнулася з шэрагам праблем, у тым ліку з несумяшчальнасцю яе структуры з польскай эканомікай, а таксама з недастатковай інфраструктурай і інвестыцыямі. Агрэсіўная палітыка з боку польскіх улад прывяла да разбурэння інфраструктуры і эканомікі ў некаторых рэгіёнах Беларусі. Гэта было звязана з адсутнасцю падтрымкі з боку дзяржавы ў сферы гандлю і прамысловасці, а таксама абмежаваным выкарыстаннем сухапутных і водных транспартных маршрутаў.

Аднак, трэба адзначыць, багатая сетка чыгунак і шосаў да вайны шмат памагала развіццю краіны [1, с. 38]. Так, Віленшчына мела 29 вёрст чыгуначных ліній на 1000 кв. вёрст, тады як Міншчына, напрыклад толькі 15 вёрст. У 1933 г. была пабудавана чыгуначная станцыя Міёры на новазбудаванай чыгуначнай лініі Варапаева – Друя, дзякуючы якой прадукцыя местачковай фабрыкі запалкавай саломкі паступала на ўсе рынкі Віленшчыны [4, с. 77]. Асаблівую ролю польскі ўрад надаваў будаўніцтву дзяржаўных ваяводскіх, павятовых і гмінных дарог з мэтай пашырэння сувязей паміж гарадамі і мястэчкамі, вёскамі, а таксама для ваенна-стратэгічных мэт [1, с. 38]. Многія мястэчкі выступалі значнымі камунікацыйнымі вузламі аўтобуснага руху [1, с. 39].

У мястэчках быў распаўсюджаны ўнутраны гандаль у трох формах: разносны гандаль, стацыянарныя крамы, а таксама кірмашы. Найбольшае значэнне меў стацыянарны гандаль, які паступова замяніў кірмашы і разносны гандаль. Усе тры формы гандлю развіваліся паралельна, узаемадзейнічаючы адзін з адным і выконваючы свае пэўныя функцыі: кірмашы і разносны гандаль абслугоўвалі ў асноўным вёскі, а стацыянарная форма гандлю – мястэчкі.

Разносная форма андлю – гэта такая форма гандлю, пры якой сяляне і дробныя прадпрыемцы ездзілі з сяла ў сяло ці на гарадскія кірмашы, каб прадаваць свае тавары, такія як сельскагаспадарчая прадукцыя, рамесныя вырабы і іншае. Разносны гандаль галоўным чынам складаўся з адзення і прадуктаў харчавання. Гандляры прадуктамі харчавання пільнуліся сельскай мясцовасці (61,1% ад агульнага ліку развязкаў гэтай галіне зафіксавана ў сельскай мясцовасці), у меншай ступені гэта дакранаецца гандлю адзеннем (47,3%). У гарадах засяроджаны гандляры раздробнымі таварамі (больш за 3/4) [9, с. 48]. Віленскае ваяводства адрознівалася лікам гандляроў-вандроўнікаў, а таксама гандляроў, якія займаліся гандлем на хаце, для якога характэрна вылучны нізкі сярэдні лік пакупнікоў. Адменнай папулярнасцю тут карысталіся гандаль прадуктамі харчавання, даставы сельскагаспадарчых жывёлін, прадуктаў раслінаводства і гадоўлі жывёлы. Так, Дзісна і Браслаўскае Паазер'е з'яўляліся месцамі з найболей пашыраным разносным гандлем. У гэтых рэгіёнах былі распаўсюджаны гандлёвыя шэрагі раздробных прадметаў і адзення. Тое ж назіралася і ў Докшыцкім рэгіёне. У Дрысвятах у асноўным групаваліся гандляры вытворчымі таварамі [9, с. 41].

Стацыянарная форма гандлю ў мястэчках Заходняй Беларусі ў перыяд з 1921 па 1939 гады ўяўляла сабой сістэму гандлёвых кропак, якія знаходзіліся на пастаянным месцы і прапаноўвалі шырокі асартымент тавараў. У стацыянарных крамах можна было набыць прадукты харчавання, адзенне, прадметы побыту, тавары першай неабходнасці і іншыя тавары. Такія крамы забяспечвалі насельніцтва мястэчак таварамі і неабходнымі таварамі, а таксама гулялі ролю сацыяльнага цэнтра, дзе жыхары размаўлялі, абменьваліся навінамі і праводзілі час. Колькасць магазінаў, дробных і сярэдніх лавак

у буйных мястэчках вагалася ад 25 да 150, у дробных – да 50. Пераважалі прадуктовыя магазіны, бакалеі, магазіны галантарэйных і каланіяльных тавараў, карысталіся попытам лаўкі рамесных вырабаў, крамы адзення, абутку, кандытарскія і мясныя лаўкі [3, с. 150].

У асноўным усёй гандлёвай дзейнасцю на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў гэты перыяд займалася габрэйскае насельніцтва. Габрэі на беларускіх тэрыторыях яшчэ з мінулых стагоддзяў гралі значную ролю ў развіцці гандлю. Перыяд з 1921 па 1939 гады не стаў выключэннем. Габрэі гралі значную ролю ў раздробным гандлі, валодалі крамамі, прапануючы размаітыя тавары для мясцовага насельніцтва. Яны таксама займаліся аптовым гандлем і пасярэдніцтвам паміж вытворцамі і спажыўцамі. Паводле дадзеных попісу насельніцтва, праведзенага ў 1921 годзе, на долю габрэйскага насельніцтва даводзілася ледзь больш за 60% удзелу ў гандлёвай чыннасці, што паказвае вядоўцу роля дадзенай этнічнай групы ў гандлёвых адносінах дадзенага рэгіёна [8]. Аднак, нягледзячы на ўсе заслугі габрэйскага насельніцтва ў гандлёвай сферы, мясцовае насельніцтва ставілася да іх вельмі грэбліва. Гэта звязана з тым, што габрэі даволі часта займаліся кантрабандай. Польскія ўлады прымалі шэраг антысеміцкіх законаў, што абмяжоўвалі правы габрэяў і іх магчымасць браць удзел у грамадскім і палітычным жыцці краіны [6, с. 916]. З-за гэтага развозны гандаль усё менш прывабліваў яўрэяў, і на іх месца прыходзілі хрысціяне. Вулічныя гандляры-хрысціяне займаліся продажам пераважна нехарчовых тавараў, у той час як сярод гандляроў-яўрэяў быў распаўсюджаны продаж харчовых тавараў. У яўрэяў нехарчовымі таварамі гандлявалі, як правіла, мужчыны, а сярод хрысціян – жанчыны [10, с. 35].

Кірмашы ў 1921–1939 гг. пастунова страчваюць ролю дамінуючай формы таваранага абарачэння, колькасць іх паступова скарачаецца па прычыне нізкіх таваразваротаў і канкурэнцыі з боку стацыянарных форм гандлю.

У буйных гарадах кірмашы праходзілі галоўным чынам па каталіцкіх святах, радзей праваслаўнх святах 10-12 разоў на год. Выняткам з'яўлялася Друя, дзе кірмашы праходзілі не на хрысціянскія святы, а на рускія народныя [7, с. 36]. У мястэчках праходзілі штотыднёвыя кірмашы і доўжыліся ў большасці адзін дзень. Аднак выключэннем з’яўлялася Друя, дзе праводзілася ўсяго тры кірмашы ў год, але кожны з іх доўжыўся цэлы тыдзень. Гэта дазваляла забяспечыць патрэбнымі таварамі само мястэчка і пазбыцца лішкаў прадуктаў і тавараў [7, с. 36].

Немалаважную ролю ў структуры ўнутранага размеркавання прадуктаў адыгрываў базарны гандаль, які паступова выцясняў кірмашы. У буйных мястэчках і малых гарадах таргі збіраліся тры разы на тыдзень, у некаторых мястэчках – два (Дзісна, Відзы, Новы Пагост, Міеры), а ў большасці – адзін раз на тыдзень [3, с. 154]. У мястэчках Віленскага ваяводства згодна з распараджэннем міністра ўнутраных спраў ад 1929 г. былі ўстаноўлены наступныя гадзіны гандлю: для кірмашоў – 7.00 – 13.00 (летам), 8.00 – 13.30 (зімой); для таргоў – 10.00 –18.00 (у святочныя дні і ў нядзелю), 10.00 – 21.00 (у звычайныя дні) [3 С. 154]. Варта адзначыць, што ў суботу кірмашы не праводзіліся з прычыны велізарнай колькасці габрэйскага насельніцтва. Таргі, як у прынцыпе і заўсёды, праходзілі на рынкавых пляцах, якія былі напоўнены крамкамі, у якіх ужо прадаваліся тавары [5, с. 49].

Урад Польшчы распрацаваў асноўныя правілы і інструкцыі па арганізацыі і правядзенні камерцыйнай дзейнасці ў гарадах Заходняй Беларусі. У рамках рэгламенту рэгуляваліся наступныя аспекты: якасць, колькасць і кошт тавараў, іх месцазнаходжанне, умовы захоўвання і продажу, а таксама паводзіны прадаўцоў і пакупнікоў. Прадаўцам расхвальваць свой тавар крыкам забаранялася, пакупнікам забаранялася каштаваць і чапаць тавар рукамі. На гандлёвым месцы павінна быць шыльдачка з месцам жыхарства, імем і прозвішчам прадаўца. Падпісвалася і кожная адзінка прадаваемага тавара. Прадавец кандытарскіх і мяса-малочных вырабаў павінен быў мець белы фартух з нарукаўнікамі і накладваць тавар лапаткай ці шчыпцамі і г. д. [2, с. 155].

У Польскай дзяржаве выпускаліся адмысловыя выданні, дзе былі ўсталяваны тэрміны ўсіх кірмашоў ва ўсіх ваяводствах. Так, у Браслаўскім павеце кірмашы праходзілі ў такіх населеных пунктах, як Друя, Дрысвяты, Каз’яны, Леанполь, Мёры, Новы Пагост, Опса, Слабодка, Відзы, Друйск, Пераброддзе [10, с. 30]. У Дзісненскім павеце найчасцей таргі праходзілі ў Докшыцах, Дзісне, Глыбокім, Германавічах, Параф'янава, Плісе, Празароках і ў Шаркаўшчыне. У Пастаўскім павеце кірмашы праходзілі ў саміх Паставах, Дунілавічах і ў Варапаева [10, с. 30]. Аднак, з прычыны таго, што кірмашы перастаюць быць дамінуючым відам гандлёвай дзейнасці, іх наяўнасць у дадзеным спісе магла быць праігнараваная і яны не праводзіліся ў прынцыпе. Так, у справаздачы за 1929 г. віленскі ваявода адзначыў, што ў мястэчку Друйск Браслаўскага павета кірмашы 7 студзеня, 9 мая, 12 жніўня адбываліся не заўсёды [3, с. 153].

Большасць местачковых кірмашоў у 1921–1939 гг. па тaварнай спецыялізацыі былі ўніверсальнымі, на якіх можна было набыць самыя разнастайныя па асартыменту тавары як сельскагаспадарчыя, так рамесныя і прамысловыя. Другімі па значэнню былі сельскагаспадарчыя кірмашы. Тут галоўнымі былі земляробча-раслінная і мяса-рыбна-птушыная прадукцыя.

Арганізацыя і правядзенне спецыялізаваных кірмашоў звычайна ажыцяўлялася за межамі ці на акраіне мястэчка. Так, збожжавы кірмаш у Новым Пагосце Браслаўскага павета з 1937 г. быў перанесены па рашэнню гміннай рады з цэнтра за межы мястэчка [3, с. 153].

Мястэчкі Віленскага ваяводства былі цэнтрамі па вытворчасці кандытарскіх і хлебных вырабаў. Местачковыя пякарні з'яўляліся дробнымі немеханізаванымі рамеснымі прадпрыемствамі, на якіх працавала ад 1 да 3 рабочых. Уладальнікамі пякарняў былі пераважна яўрэі. У Браславе ў 1927 г. працавалі 7 дробных яўрэйскіх пякарняў [6, с. 579]. У Друе можна было часта сустрэць гандаль конскім воласам і свіным шчаціннем. Пашырана была красаніна – шчыльная адбеленая льняная тканіна, найчасцей афарбаваная цёмна-сіні колер [7, с. 288]. Таксама на гандлёвых крамах прадаваўся джухт – выраб з цялячай ці авечай скуры, афарбаванай у чырвоны колер [7, с. 290].

Адным з самых пашыраных тавараў на кожным кірмашу з'яўляецца жывёла. Продаж жывёлы на кірмашах быў папулярнай з'явай з-за попыту на мяса і малако ў сельскай мясцовасці. Тут жа на продаж ішлі сала, мяса-малочныя прадукты і нават конныя калёсы, так патрэбныя для сялян. [7, с. 299].

Пводле закона ад 23 красавіка 1920 г. абмяжоўваўся продаж алкагольных напояў, што значна падарвала продаж тавару на кірмашах. Аднак, сучаснікі апісваюць кірмашы таго перыяду як «свята нячыннасці і п'янства» [7, с. 308]. Гэта можа сведчыць аб тым, што людзі знаходзілі спосабы абыходзіць гэтыя забароны і ладзілі п'яныя святы на кірмашах. Магчыма, існаваў нелегальны гандаль алкаголем.

Беларускі кірмаш, адроджаны на нацыянальнай аснове, з'яўляўся шматфункцыянальным святам, які прадстаўляў чалавеку магчымасць задаволіць разнастайныя матэрыяльныя запатрабаванні. Рамеснікі з усёй акругі прывозілі свае вырабы на кірмашы, каб прадаць іх пакупнікам. Ганчары выраблялі гліняны посуд розных формаў і памераў, у тым ліку гаршкі, міскі, збаны і вазы. Гарбары вытваралі скуру і шылі з яе абутак, сумкі, рамяні. Ткачы выраблялі тканіны ў асноўным з лёну, воўны і бавоўны, з гэтых тканін ужо шылі вопратку, абрусы, ручнікі і вышывалі.

Такім чынам эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд знаходзілася на даволі нізкім узроўні. Буржуазныя адносіны былі адноўлены, але беларуская эканоміка сутыкнулася з праблемамі, такімі як несумяшчальнасць структуры з польскай эканомікай, недастатковая інфраструктура і інвестыцыі. У гэтым стане гандаль у мястэчках заходнебеларускага Падзвіння адыгрываў значную ролю ў эканоміцы рэгіёна, а кірмашы, якія раней былі асноўнай формай гандлю, з часам страцілі сваю значнасць з-за нізкай актыўнасці і канкурэнцыі з боку стацыянарных магазінаў.

ЛІТАРАТУРА


1. Вайцешчык Г.С. Матэрыяльны дабрабыт насельніцтва мястэчак Заходняй Беларусі у 1921-1939 гг. / Г.С. Вайцешчык // Веснік Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы. Серыя 1. Гісторыя і археалогія. Філасофія. Паліталогія: навуковы часопіс, – 2013. – №1. С. 32-44.
2. Вабічшэвіч А.М. Нацыянальна-культурнае жыццё Заходняй Беларусі (1921-1939) / А.М. Вабішчэвіч. – Брэст: БрДУ, 2008. – 319 с.
3. Гандлёвыя функцыі мястэчкаў Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг.: матэрыялы Міжнароднай навуковай канферэнцыі, Гродна, 18–19 лістапада 2010 г. / Гродз. дзярж. ун-т; рэдкал.: Г. Хацкевіч, Я. Панькоў, Э. Ярмусік, І. Папоў (гал. рэд.) [і інш.]. – ГрДУ, 2010. – 151 с.
4. Князева, В. Падарожжа па Беларусі: гарады і гарадскія пасёлкі / В. Князева. – Мінск : Беларусь, 2005. – 303 с.
5. Роль евреев в экономическом развитии местечек Западной Беларуси в 1921–1939 гг.: материалы IV Междунар. науч. конф., Гродно, 11–12 мая, 2011 г. / Гродн. гос. аграр. ун-т; редкол.: Л. Л. Мельникова (отв. ред.) [и др.]. – ГГАУ, 2011. – 134 с.
6. Borowski, M. Spis mejscowości. Do części adresowej / M. Borowski. – Warszawa: KSRP, 1927. – 2479 s.
7. Hedemann O., Historja powiatu brasławskiego / O. Hedemann. –Wilno : Nakładem Sejmiku Brasławskiego, 1930. – 483 s.
8. Mortkowicz, J. Żydzi: gospodarka II Rzeczypospolitej: [o udziale Żydów w rozwoju polskiej gospodarki] / J. Mortkowicz // Sprawy narodowościowe. – 1929. – 18 czerwiec – S. 232.
9. Ormicki, W. Skup zawodowy i handel obnosny w województwach Wileńskim, Nowogródzkim, Poleskim i Wołyńskim (studium geograficznogospodarcze) / W. Ormicki. – Wilno: Izba Przemysłowo-Handlowa, 1938. – 46 s.
10. Szyszkowski, M. Handel domokrążny i uliczny / M. Szyszkowski. – Warszawa, 1937. – 43 s.